# Весці

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

**Навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 4 (42) 2004**

**Серыя 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**

*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
*(нам. галоўнага рэдактара)*
В. В. Бушчык
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
М. С. Вайтовіч
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Л. М. Давыдзенка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
*(адказны сакратар)*
Г. А. Космач
А. М. Люты
І. А. Новік
А. У. Рагуля
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
М. Т. Стэльмашук
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч

## Змест

### *Гісторыя*

*Талкачоў В. І.* БЕЛАРУСКІ ДРУК І ФАРМІРАВАННЕ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА ........ 3

*Конеў Я. Ф.* БЕЛАРУСКАЕ ЛЕТАПІСАННЕ — КРЫНІЦА ФАРМІРАВАННЯ СУЧАСНАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ ........ 6

*Мельнікаў І. В.* ШЛЯХТА БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ Ў ПРАЦАХ ПОЛЬСКІХ ГІСТОРЫКАЎ НА ПРЫКЛАДЗЕ ГРАФСКАГА РОДУ ЗАБЕЛА БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ........ 9

*Гаштольд С. В.* РАЗВІЦЦЁ СІСТЭМЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ АШЧАДНЫХ КАС У БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX — ПАЧАТКУ XX ст. ........ 11

*Ганчарова І. В.* ГРАШОВЫЯ ПАДАТКІ Ў БЕЛАРУСКІХ ГАРАДАХ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст. ........ 15

*Кандратовіч А. А.* ГАНДЛЁВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯЎРЭЯЎ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. ........ 18

*Васілеўская К. В.* РАЗВІЦЦЁ РАЗУМЕННЯ ТЭРМІНА «РЭВАЛЮЦЫЯ» Ў ЧАС РЭВАЛЮЦЫІ Ў ФРАНЦЫІ (КАНЕЦ XVIII ст.) ........ 20

*Груца І. А.* МАСКОЎСКІЯ ТРАФЕІ НАПАЛЕОНА: МІФЫ І РЭАЛЬНАСЦЬ ........ 23

*Жылінская І. У.* ПРАЦА З МОЛАДДЗЮ ЯК ПРЫЯРЫТЭТНЫ КІРУНАК СУПРАЦОЎНІЦТВА СССР І ВЯЛІКАБРЫТАНІІ Ў 30-я гг. XX ст. ........ 26

*Космач А. М.* ПРЭСА ЗША АБ УНУТРАНЫХ ПРАБЛЕМАХ КАРАЛЕЎСТВА СЕРБАЎ, ХАРВАТАЎ І СЛАВЕНЦАЎ (1918—1920 гг.) ........ 29

*Варывончык І. В.* РОСТ САЦЫЯЛЬНАЙ НЯРОЎНАСЦІ: ДАХОДЫ І ЎЛАСНАСЦЬ У ПАСЛЯВАЕННАЙ АМЕРЫЦЫ ........ 34

*Смірноў А. У.* САВЕЦКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ АБ ПАЗІЦЫІ АНГЛІІ Ў ГЕРМАНСКІМ ПЫТАННІ 1945—1954 гг. ........ 37

### *Філасофія*

*Красюк У. Ф.* САМАІДЭНТЫФІКАЦЫЯ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ І ДУХОЎНАЯ ДЫНАМІКА МАЛАДЗЁЖНЫХ СУБКУЛЬТУР ........ 39

*Міхневіч А. А.* НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ: СІНХРОННАЕ І ДЫЯХРОННАЕ СІСТЭМНЫЯ МНОСТВЫ ........ 41

*Васько І. І.* АНТРАПАЛАГІЧНЫЯ ПРАДПАСЫЛКІ САЦЫЯЛЬНАЙ ДУМКІ РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ ........ 44

### *Паліталогія*

*Сіманоўскі С. І.* МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПАРАЎНАЛЬНАГА АНАЛІЗУ Ў ПАЛІТЫЧНАЙ НАВУЦЫ ........ 50

*Зенчанка В. А.* ПРАБЛЕМЫ МАДЭРНІЗАЦЫІ ГРАМАДСТВА: ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА ........ 53

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бібліятэка
БДПУ ... Танка

ЛІТАРАТУРА

1. *Бабеф Г.* Сочинения: В 4 т. М., 1977. Т. 3.
2. *Барнав А.* Введение во французскую революцию: Хрестоматия по французскому материализму XVIII века. Пг., 1923. Вып. 2. Учение об обществе.
3. *Буонаротти Ф.* Заговор во имя равенства. М., 1963. Т. 2.
4. Документы истории Великой французской революции. М., 1990.
5. Европейский либерализм в XIX в. Антология его развития. М., 1989.
6. *Ландауэр Г.* Письма о французской революции. М., 1925. Т. 2.
7. *Олар А.* Ораторы революции. М., 1908.Т. 2. Законодательное собрание и Конвент.
8. *Попов-Ленский И. Л.* Антуан Барнав и материалистическое понимание истории. М.; Л., 1924—1925.
9. Революционное правительство во Франции в эпоху Конвента (1792—1794). М., 1927.
10. *Робеспьер М.* Избранные произведения: В 3 т. М., 1965. Т. 1.
11. *Робеспьер М.* Избранные произведения: В 3 т. М., 1965. Т. 2.
12. *Устинов В. М.* Учение о народном представительстве. М., 1912. Т. 1. Идея народного представительства в Англии и Франции до начала XIX в.
13. Французская революция XVIII века. Экономика. Политика. Идеология. М., 1988.
14. Barnave ocuvres. Paris, 1843. V. 1.
15. Barnave ocuvres. Paris, 1843. V. 2.
16. *Michon G.* Essai sur l'histoire du parti feuillant. Adrien Duport correspondance inedited de Barnave en 1792. Paris, 1924.



SUMMARY

*The article tells about the evolution of the notion "revolution" during the revolution in France at the end of the 18-th century. The author also analyses the main phases and the direction of the change – from the rationalist paradigm of Natural rights to the social –historic paradigm. Also the analogies and the differences in the understanding of the notion are investigated, which were characteristic of the main revolutionaries.*


*УДК 947.072.5*

***І. А. Груца***

# МАСКОЎСКІЯ ТРАФЕІ НАПАЛЕОНА: МІФЫ І РЭАЛЬНАСЦЬ

Узнікненне словазлучэння «маскоўскія трафеі» звязана з рашэннем Напалеона вывезці ў Францыю святыні праваслаўнага хрысціянства і гісторыка-культурныя рэліквіі народаў Расійскай імперыі, якія захоўваліся ў саборах і ўрадавых установах Маскоўскага Крамля. Менавіта яны былі закліканы служыць наглядным доказам перамогі ў ваеннай кампаніі 1812 г.

Сам факт рабавання напалеонаўскімі войскамі Маскоўскага Крамля не выклікаў сумненняў у дваранскіх і буржуазных расійскіх гісторыкаў. Аднак здзіўляе, што ніхто з іх не прыводзіў дакладнага і поўнага пераліку маскоўскіх трафеяў Напалеона, а ўрад Расійскай імперыі ніколі публічна не выказваў зацікаўленасці ў высвятленні іх лёсу.

Здаецца, што тлумачэнне да праблемы лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона заключаецца ў адносінах да яе вышэйшых службовых асоб Расійскай імперыі і іерархаў Рускай Праваслаўнай Царквы.

Яшчэ ў ходзе Айчыннай вайны 1812 г. і пасля яе заканчэння на старонках перыядычнага друку разгарнулася палеміка аб лёсе нацыянальнай святыні рускага народа і праваслаўнага хрысціянства — крыжа са званіцы Івана Вялікага ў Крамлі. Яе вынікам стала афіцыйная версія, згодна з якой крыж рабаўнікамі з Масквы не вывозіўся і ён, калі растаў снег, быў знойдзены каля сцен званіцы [1, с. 345]. Пры гэтым спроба Напалеона пасягнуць на нацыянальную святыню закончылася няўдачай.

На самай справе Напалеон і не планаваў вывозіць крыж з Масквы, паколькі ажыццявіць тэхнічна гэта было надзвычай цяжка: па розных даных даўжыня крыжа са званіцы Івана Вялікага складала ад 6 да 9 м. З жалезнай асновы крыжа знялі медныя (сярэбраныя?) пазалочаныя пласціны, якімі ён быў абкладзены, і змясцілі іх у абозе, які прызначаўся для перавозкі менш каштоўнай часткі маскоўскіх трафеяў. У Парыжы ўмельцы-кавалі па памерах пласцін змаглі б адкаваць жалезную аснову крыжа і ўстанавіць яго на даху Дома інвалідаў, як гэтага жадаў Напалеон.

Напярэдадні, калі Масква была пакінута рускімі войскамі, у пісьмах і рапартах маскоўскага губернатара графа Растопчына сцвярджалася, што ўсе каштоўнасці з горада былі своечасова эвакуіраваны. Гэта інфармацыя не адпавядала рэчаіснасці, што потым прызнаў сам граф [2, л. 18]. Адрасатам рапартаў з'яўляўся імператар Аляксандар І, з яго боку і з боку ўрада інфармацыя ў іх не абвяргалася. Такім чынам, сцвярджэнне Растопчына аб паспяховай эвакуацыі з Масквы ўсіх каштоўнасцей лягло ў аснову пазіцыі дзяржавы аб адносінах да

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

дадзенай праблемы. Яе сутнасць заключалася ў тым, што трафеі напалеонаўскай арміі складалі прадметы раскошы і іншыя каштоўнасці, нарабаваныя ў дамах гараджан і ў няўрадавых установах Масквы. А таму як напалеонаўская армія амаль поўнасцю загінула ў ходзе адступлення і яе абозы сталі здабычай рускіх войск, то ўсё нарабаванае не пакінула межаў Расійскай імперыі.

Такі падыход аб лёсе маскоўскіх трафеяў панаваў на працягу ўсяго кіравання імператара Аляксандра I і як нельга лепш адпавядаў яго славе як пераможцы. На самай справе — войскі захопніка разбіты, іх камандуючы дзівам пазбег палону, усё нарабаванае ворагам адбіта слаўнымі рускімі воінамі! Ці мог сысці выратавальнік Еўропы, у ролі якога выступаў Аляксандр I на Венскім кангрэсе, да апытання прадстаўнікоў Напалеона аб лёсе некалькіх павозак з прадметамі з Аружэйнай палаты і цэркваў Маскоўскага Крамля? У час, калі абмяркоўваўся перадзел напалеонаўскай імперыі і ўстанаўленне новага парадку ў Еўропе, пытанне аб лёсе маскоўскіх трафеяў выглядала малазначным і забытым.

Такім чынам, праблема лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона адразу пасля заканчэння Айчыннай вайны 1812 г. стала заложніцай пазіцыі ўрада Расійскай імперыі, які рабіў выгляд, што такой праблемы ніколі не існавала. Не маючы сацыяльнага заказу з боку ўрада на яе вывучэнне і вырашэнне, вучоныя-гісторыкі ігнаравалі вывучэнне праблемы лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона. Пры гэтым яны лічылі, што іх пошукамі павінен займацца ўрад. Урад, не прызнаючы публічна наяўнасці гэтай праблемы, на працягу XIX ст. аказваў падтрымку ветэранам Вялікай арміі ў пошуках каштоўнасцей, схаваных імі на тэрыторыі Расійскай імперыі ў 1812 г. [3]. Аднак усе яны закончыліся безвынікова, і менавіта гэтыя абставіны садзейнічалі паступоваму пераўтварэнню канкрэтнай гістарычнай праблемы ў міф.

У такім выглядзе яна дасталася ў спадчыну гістарычнай навуцы ў СССР. Паколькі ў савецкай дзяржаве рэлігія лічылася «опіумам для народа», афіцыйныя ўлады не былі зацікаўлены ў публічным абмеркаванні праблемы лёсу святынь праваслаўнага хрысціянства ў Айчыннай вайне 1812 г. У сувязі з гэтым вучоныя-гісторыкі не бачылі сэнсу займацца вывучэннем дадзенай праблемы, якая насіла на гэты час напалову міфічны характар. Як вынік, рашэнне праблемы лёсу рэлігійных святынь праваслаўя і гісторыка-культурных рэліквій народаў Расійскай імперыі ў Айчыннай вайне 1812 г. было аддадзена энтузіястам. Пры падтрымцы сродкаў масавай інфармацыі яны правялі некалькі экспедыцый з мэтай пошуку легендарных скарбаў у азёрах Сямлёўскае і Стаячае. Аднак гэта прывяло да таго, што лёс маскоўскіх трафеяў як навуковая праблема быў абвергнуты. Рэзультаты пошукаў садзейнічалі яе канчатковай міфалагізацыі, паколькі закончыліся безвынікова [4].

Варта адзначыць, што дадзеная праблема не мае ніякіх адносін да міфаў, паколькі ў яе аснове ляжаць дакладныя гістарычныя факты.

Масква з'яўлялася не толькі першай сталіцай Рускай дзяржавы, але і цэнтрам праваслаўя. Гэтыя абставіны абумовілі высокую канцэнтрацыю менавіта ў Маскве гісторыка-культурных і рэлігійных рэліквій. Дарэчы, частку гістарычных рэліквій складалі знамёны, захопленыя ў перамаганосных бітвах з арміямі суседніх дзяржаў. У іх ліку знаходзіліся знамёны Рэчы Паспалітай, у склад якой з 1569 г. уваходзілі землі Вялікага княства Літоўскага, гэта значыць сучаснай Беларусі. Напярэдадні Айчыннай вайны 1812 г. яны захоўваліся ў спецыяльна створанай для гэтай мэты ўрадавай установе — Аружэйнай палаце.

Імклівае наступленне напалеонаўскіх войск не дазволіла з-за недахопу часу і сродкаў поўнасцю эвакуіраваць усе каштоўнасці з Масквы. Генерал-губернатар Масквы граф Ф. І. Растопчын вымушаны быў пакінуць нечапаным унутранае ўбранства маскоўскіх храмаў, баючыся, што іх эвакуацыя выкліча хваляванні сярод гараджан. Не ўдалося ў поўным аб'ёме вывезці з Масквы гістарычныя рэліквіі, якія захоўваліся ў Аружэйнай палаце. Шматлікія экспанаты былі схаваны на тэрыторыі Крамля ў наспех зробленых тайніках. Большасць з іх былі знойдзены гвардзейцамі Напалеона і разрабаваны [5, с. 6—7].

Зразумеўшы, што расійскі імператар Аляксандр I на заключэнне міру не пойдзе, Напалеон вырашае адступаць з Масквы. Рыхтуючыся да адступлення, ён аддае загад забраць з храмаў Крамля і Аружэйнай палаты тыя прадметы, якія б наглядна сведчылі аб яго знаходжанні ў Маскве. Для адбору трафеяў была створана спецыяльная камісія на чале з баронам дэ Сен-Дзідзье. Гэты факт упамінаўся ў асобных даследаваннях дарэвалюцыйных гісторыкаў, але без указання на тое, якія прадметы былі канфіскаваны з крамлёўскіх сабораў [6].

Як вынік, усе энтузіясты, якія займаліся пошукам легендарных трафеяў, ніколі не маглі растлумачыць: «А што яны, уласна, шукаюць?». Дадзеныя абставіны, разам з беспаспяховасцю шматлікіх пошукаў маскоўскіх трафеяў і адсут-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

многа сур'ёзных навуковых даследаванняў па абазначанай праблеме, пераўтварылі яе ў міф.

На сённяшні дзень бачыцца яўны крызіс у спробах разгадаць апошнюю і самую інтрыгуючую тайну Айчыннай вайны 1812 г. Яго сведчаннем з'яўляецца бясконцае паўтарэнне ў друкаваных і электронных сродках масавай інфармацыі ў розных варыяцыях агульнавядомых фактаў аб пошуках маскоўскіх трафеяў Напалеона, заклікі зноў і зноў правяраць ужо неаднаразова правераныя версіі іх лёсу, а таксама выкарыстанне асобнымі журналістамі гэтай тэмы для першакрасавіцкіх і калядных розыгрышаў сваіх чытачоў [7].

На думку аўтара, публікацыя дакумента пад назвай «Трофеи Кремля. Состояние предметов, отправленных во Францию в качестве трофеев во исполнение указов Его Императорского Величества и Короля» дазволіць дэміфалагізаваць праблему лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона і ўзнавіць цікавасць да яе не толькі з боку энтузіастаў-скарбашукальнікаў, але і прафесійных гісторыкаў. Такім чынам, маскоўскія трафеі Напалеона былі прадстаўлены наступнымі прадметамі:

**Скрынка № 1**

Скрынка, што аздоблена чырвоным аксамітам, у якой знаходзяцца:

1. Драўляны крыж, які ўтрымлівае часткі сапраўднага крыжа.
2. Другі маленькі крыж, аздоблены самацветамі.
3. Чатыры маленькія лыжачкі.
4. Тры маленькія нажы.
5. Залатыя вырабы для правядзення рэлігійных цырымоній у маленькім футляры:

— Вялікае Евангелле з пяццю медальёнамі з эмалі.
— Каўчэг, у якім знаходзіцца рука Святога Андрэя.
— Маленькі кубачак з пазалочанага і чаканнага серабра.
— Маленькае Евангелле, пакрытае дзвюма пласцінамі з пазалочанага серабра, з пяццю медальёнамі з эмалі ў апраўе са стразаў.
— Залаты кубак.
— Блюда, якое выкарыстоўваецца для прычасця, у чахле з зялёнага аксаміту.
— Маленькі крыжык з горнага крышталю ў чахле.
— Тры іконы.

**Скрынка № 2**

Царкоўныя ўпрыгожанні.

**Скрынка № 3**

1. Карціна з выявай магілы Святой Дзевы, упрыгожаная некалькімі каштоўнымі камянямі.
2. Карціна Святой Дзевы, пакрытая золатам, з каронай з брыльянтаў і арэолам, упрыгожаным жамчугамі.

Заўвага. На карціне надпіс на рускай мове: «Французы и поляки были побеждены русскими, и в 1733 году был взят город Данциг. Императрица Анна Ивановна разбогатела. В 1740 году на этой картине Святой Девы появились жемчуга и бриллианты в знак благодарности за это событие».

3. Тры посахі епіскапскія.
4. Сем пакетаў:

1. Пакет пад нумарам 1, у якім знаходзіцца маленькая брыльянтавая карона, якая належыць іконе № 1.
2. Пакет пад нумарам 2, у якім знаходзіцца ўпрыгожаная жэмчугам і каштоўнымі камянямі карона, увянчаная пяццю чубкамі з рубінамі і васьмю такімі ж асобнымі разеткамі.
3. Пакет пад нумарам 3, у якім знаходзяцца разнастайныя самацветы.
4. Пакет пад нумарам 4, у якім знаходзяцца разнастайныя, як мяркуецца, каштоўныя камяні.
5. Пакет пад нумарам 5, у якім знаходзяцца буйныя і сярэднія жамчужыны.
6. Пакет пад нумарам 6, у якім знаходзяцца маленькія жамчужыны.
7. Пакет пад нумарам 7, у якім знаходзяцца шэсць маленькіх брыльянтавых карон.

5. Дапаўненне да царкоўных упрыгожанняў, якія знаходзяцца ў скрынцы № 2.

**Скрынка № 4**

87 сцягоў, знамён, штандараў.

**Скрынка № 5**

1. Сем прадметаў старажытных даспехаў.
2. 60 сцягоў, знамён, штандараў.

Масква, 10 кастрычніка 1812 года.

Аўдытар Дзяржаўнага савета, старшыня камісіі, упаўнаважаны на пошук каштоўных прадметаў, якія захоўваюцца ў саборах Крамля, барон дэ Сен-Дзідзье.

12 кастрычніка 1812 г. спіс трафеяў быў адасланы з Масквы ў Парыж ваеннаму міністру Францыі, каб той аддаў неабходнае распараджэнне для забеспячэння аховы, калі яны прыбудуць «на тэрыторыю імперыі» [8, с. 200—202]. Але, выйшаўшы з Масквы, абоз з трафеямі ў Францыю не трапіў. За гады, што прайшлі з таго часу, рэчы, якія былі ў ім, нягледзячы на шматлікія пошукі, у Маскву не вярнуліся. Усё гэта дазваляе меркаваць, што рэлігійныя святыні праваслаўнага хрысціянства і гісторыка-культурныя рэліквіі, якія ўваходзілі ў маскоўскія трафеі Напалеона, былі схаваны ў ходзе адступлення яго арміі на тэрыторыі Расіі або Беларусі. Такая ж доля магла спасцігнуць і другую частку маскоўскіх трафеяў Напалеона, прадстаўленую менш каштоўнымі прадметамі з праваслаўных храмаў і ўрадавых устаноў Масквы, а таксама зліткамі золата і серабра, у якія былі пераплаўлены найбольш буйныя царкоўныя ўпрыгожанні. Гэта частка трафеяў пакінула Маскву ў абозах Вялікай арміі пасля загаду Напалеона аб пачатку адступлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як гаварылася вышэй, гістарычныя рэліквіі ўключалі знамёны і Рэчы Паспалітай, а гэта значыць, што яны адносяцца да нацыянальных рэліквій сучасных незалежных еўрапейскіх дзяржаў — Беларусі і Польшчы. Значную частку маскоўскіх трафеяў складалі святыні праваслаўя — рэлігіі, якая з'яўляецца традыцыйным веравызнаннем большасці насельніцтва Беларусі. Паколькі з 1772 г. беларускія землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, то насельніцтва сваёй працай садзейнічала яе ўзвышэнню.

Веліч любой дзяржавы вызначаецца яе ўкладам у развіццё сусветнай цывілізацыі. Нацыянальныя рэліквіі з'яўляюцца матэрыяльным увасабленнем гэтага ўкладу. Менавіта ў іх гісторыя, мастацтва і майстэрства рамеснікаў арганічна спалучаюцца ў адзінае цэлае і служаць канкрэтным наглядным доказам паступальнага развіцця дзяржавы. Чым больш у дзяржаве нацыянальных рэліквій, тым мацнейшае ў яе грамадзян пачуццё нацыянальнай годнасці і патрыятызму, без якіх немагчыма пабудова развітога грамадства з багатымі духоўнымі традыцыямі. Такім чынам, для Беларусі лёс маскоўскіх трафеяў Напалеона не менш актуальны, чым для Расіі, паколькі ідзе размова аб нацыянальных рэліквіях усходняга славянства, якія былі страчаны каля двухсот гадоў таму.

*Літаратура і крыніцы*

1. Примечание Кремлевского жителя // Вестник Европы. 1813. Ч. 67. С. 149—150; Труды Московского отдела Императорского Русского Военно-Исторического Общества. М., 1912. Ч. 2.
2. РГИА, ф. 797, оп. 1, д. 4449.
3. РГИА, ф. 1409, оп. 1, д. 741, л. 1—6; ф. 1409, оп. 1, д. 828, л. 12; ф. 1409, оп. 1, д. 710 (ч. 1.), л. 163; НИА РБ, ф. 295, оп. 1, д. 6151, л. 17—26 об.; ф. 2001, оп. 1, д. 561, л. 11—16; ф. 1297, оп. 1, д. 5384, л. 1—6; ф. 295, оп. 1, д. 6151, л. 12—16; ГАРФ, ф. 109, оп. 58, д. 326, л. 1—19.
4. Комсомольская правда. 1979. 11 фев., 25 марта, 1 апр., 20 авг.; 1980. 13 янв.; 1981. 9 апр.; Знамя юности. 1979. 1 апр.; 1980. 12 июня, 27 нояб., 8 дек.; 1981. 12 янв., 12 фев., 22 окт., 16 нояб.; 1982. 14 янв.
5. *Лискин Ю.* Верейский след сокровищ Бонапарта // Клады и сокровища. 1998. № 5—6.
6. *Михайловский-Данилевский.* Описание Отечественной войны 1812 года. СПб., 1840. Ч. 4. С. 49; История Наполеона сочинения Николая Полевого. СПб., 1848. Т. 5. С. 87; Богданович М. История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам. СПб., 1860. Т. 3. С. 7.
7. *Супрунюк А.* Знойдзены клад Напалеона // Звязда. 1995. 5 студз.; *Бакуменко А.* Клады Наполеона // «7 ночей». 1995. 11 марта; *Шидловский Н.* Золотое эхо 1812 года // Аргументы и факты в Беларуси. 2000. № 13.
8. Histoire de la campagne de Russie pendant l'annee 1812 et de la captivite des prisonniers francais en Siberie et dans les autres provinnces de l'empireprecedes l'un hesome de l'Histoire de Russie par Emile Marco de Saint-Hilaire. Paris, 1834—1836.

*Summary*

*The fute of Moscow Napoleon trophies is discussed. The necessity of national relies of the Belarusian and Rusian people is proved.*

*УДК 940.5 (47+410)*

***І. У. Жылінская***

## ПРАЦА З МОЛАДДЗЮ ЯК ПРЫЯРЫТЭТНЫ КІРУНАК СУПРАЦОЎНІЦТВА СССР І ВЯЛІКАБРЫТАНІІ Ў 30-я гг. ХХ ст.

Культурны абмен паміж Англіяй і СССР у 30-х гг. ХХ ст. абумоўлены палітычнай і ідэалагічнай сітуацыяй, якая склалася ў той час. У 1929 г. былі аднаўлены англа-савецкія дыпламатычныя адносіны і тым самым створаны больш зручныя ўмовы для развіцця культурных сувязей паміж гэтымі краінамі.

У ажыццяўленні культурнага абмену паміж Вялікабрытаніяй і Савецкім Саюзам вялікая роля належала «Усесаюзнаму таварыству культурных сувязей з замежжам» (УТКС), што было створана ў СССР у 1925 г. На яго кіраўніцтва ўскладалася задача па каардынацыі дзеянняў з падобнымі ўстановамі культурнага збліжэння ў замежных краінах і саюзных рэспубліках. Толькі цэнтральнае праўленне УТКС мела сваіх прадстаўнікоў за мяжой з правам наладжвання і падтрымання непасрэдных кантактаў з замежнымі арганізацыямі. У Вялікабрытаніі падобнай установай з'яўлялася англійскае «Таварыства культурных сувязей з СССР» (ТКС).

У межах культурнага супрацоўніцтва актыўна ішло развіццё і паглыбленне англа-савецкіх кантактаў у галіне педагогікі. У СССР у 30-х гг. ХХ ст. стварылася унікальная сістэма адукацыі і выхавання, распрацоўваліся новыя метады працы з падрастаючым пакаленнем, якія выклікалі значную зацікаўленасць у педагогаў заходніх дзяржаў. Нельга не ўлічваць і тое, што само сацыялістычнае будаўніцтва таксама было прадметам пільнай увагі грамадзян капіталі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ